# ПАЙШОЎ З ЖЫЦЦЯ ВІКТАР ШВЕД



## 1925-2020

22 кастрычніка 2020 года пайшоў з жыцця вядомы беларускі пісьменнік Віктар Мікітавіч Швед

**Нягледзячы на тое, што ўсё сваё доўгае жыццё Віктар Мікітавіч пражыў на Беласточчыне, душой і сэрцам ён належаў Беларусі. Вядома, што на шматлікія вершы яго натхнялі валошкі (кветка-сімвал Беларусі). Паэт быў частым госцем у бібліятэках Гродзеншчыны, дзе сустракаўся з прыхільнікамі свайго таленту і шчодра дарыў ім новыя творы. Да апошняга дня Віктар Мікітавіч заставаўся шчырым, абаяльным, мудрым і творчым чалавекам, з захапленнем убіраў у сябе новыя веды, уражанні; любіў людзей і паэзію. Мы, пісьменнікі Гродзеншчыны, вельмі смуткуем з прычыны гэтай балючай страты. Памяць пра нашага сябра, сапраўднага патрыёта і майстра слова назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.**

Калектыў
Гродзенскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

Гродна - Беласток